МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

## ДЛЯ КЛАСАЎ ПАГЛЫБЛЕНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ І ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ 1-га АДДЗЯЛЕННЯ ДАПАМОЖНАЙ ШКОЛЫ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

**КАМП'ЮТЭРНАЯ ГРАМАТА**

•

**ХІМІЯ І ФІЗІКА Ў БЫЦЕ**

•

**ЭЛЕМЕНТЫ ЗАМЕЖНАЙ (АНГЛІЙСКАЙ) МОВЫ**

•

**ГРАМАДАЗНАЎСТВА**

•

**КУЛЬТУРА СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН**

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2008

© Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь, 2008
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны
інстытут адукацыі», 2008

# КАМП'ЮТЭРНАЯ ГРАМАТА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Адным са складальнікаў навучання школьнікаў у класах паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі з'яўляецца фарміраванне ў іх элементарных уменняў і навыкаў валодання камп'ютэрам.

Сёння камп'ютэрныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца ў розных сферах жыцця чалавека, і іх засваенне неабходна разглядаць як частку агульнай адукацыі разам з авалоданнем такімі навыкамі, як чытанне, пісьмо, лік і інш.

Як паказвае вопыт работы шэрагу ўстаноў спецыяльнай адукацыі, вучні 1-га аддзялення дапаможнай школы могуць авалодаць элементарнымі карыстальніцкімі ўменнямі і навыкамі, што будзе спрыяць іх сацыяльнаму развіццю, станаўленню і больш паспяховай інтэграцыі ў жыццё сучаснага грамадства.

Праграма «Камп'ютэрная грамата» арыентавана на фарміраванне ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю ўменняў працаваць з камп'ютэрам, знаёмства з яго магчымасцямі і сферай ужывання.

Праграма вызначае той мінімум ведаў і ўменняў, які дазволіць вучням на канчатковым этапе навучання самастойна выконваць пэўныя аперацыі і выкарыстоўваць простыя камп'ютэрныя праграмы.

Навучанне карыстанню камп'ютэрам мяркуе і засваенне пэўных тэарэтычных звестак, спецыяльных паняццяў і тэрмінаў, як правіла, на англійскай мове (Word, enter і г. д.), што з'яўляецца для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю досыць цяжкім, а ў асобных выпадках і немагчымым. Таму праграмай прадугледжваюцца ў большай ступені практычныя заняткі, а ў шэрагу выпадкаў і заняткі трэніровачнага характару, накіраваныя на вывучэнне і адпрацоўку паслядоўнасці тых або іншых дзеянняў (парадак уключэння і выключэння

камп'ютэра, выкарыстанне маніпулятара «мыш» і інш.). Вывучэнне школьнікамі асобных спецыяльных паняццяў і тэрмінаў здзяйсняецца толькі ў той ступені, наколькі яны неабходныя пры рабоце з камп'ютэрам.

На пачатковых этапах навучання карыстанню камп'ютэрам у якасці практычных заданняў могуць выкарыстоўвацца простыя навучальныя камп'ютэрныя гульні, што будзе спрыяць павышэнню матывацыі вучняў да авалодання новымі ведамі і ўменнямі. Разам з тым неабходна дбайна адбіраць камп'ютэрныя гульні, выключыўшы гульні з прыметамі агрэсіі, жорсткасці, гвалту і г. д. Станоўчая маральная накіраванасць камп'ютэрных гульняў і іх адпаведнасць псіхічным і фізіялагічным асаблівасцям вучняў з'яўляецца абавязковай умовай іх выкарыстання ў навучальным працэсе.

Павышаная складанасць інтэрфейса праграмнага забеспячэння (якасць і тып тэксту, графічных рысункаў, гуку, прынцыпаў зваротнай сувязі і інш.) можа ствараць цяжкасці для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Запоўнены ілюстрацыямі і насычаны рознымі колерамі фон інтэрфейса перашкаджае арыентацыі на экране і не заўсёды можа быць скарыстаны для дадзенай катэгорыі карыстальнікаў. Па гэтай прычыне рэкамендуецца дбайна выбіраць і адладжваць праграмнае забеспячэнне.

Нягледзячы на індывідуальныя магчымасці вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю рэкамендуецца пазбягаць вялікай колькасці значкоў на рабочым стале камп'ютэра, гэтак жа як фонавых рысункаў. Выявы, якія маюць выразныя контуры і высокую кантраснасць з фонам рабочага стала і дакументаў, ідэнтыфікуюцца і ўспрымаюцца значна лепш. Форма і памер курсора, яго колер, кантраснасць гэтак жа могуць быць адладжаны ў адпаведнасці з запатрабаваннямі вучня. Спалучэнне шэрагу раздражняльнікаў пры актуалізацыі аднаго і таго ж аб'екта (дэманстрацыя рысунка, гукавы сігнал, пісьмовае абазначэнне дадзенага аб'екта) будзе спрыяць працэсу яго распазнавання.

Для больш паспяховага навучання рабоце на камп'ютэры можна таксама выкарыстаць шэраг дапаможных устройстваў, якія палегчаць вучням з інтэлектуальнай недастатковасцю доступ да камп'ютэра і карыстанне ім (гл. табліцу).

*Табліца*

| Тып устройства | Мэта выкарыстання | Перавагі |
|---|---|---|
| Альтэрнатыўная клавіятура | Даць магчымасць вучням набыць гульнявыя і вучэбныя навыкі работы з камп'ютэрам | Прастата ў разуменні прынцыпаў работы дзякуючы паменшанай колькасці клавіш |
| Сенсорная клавіятура | Развіць у вучняў спецыяльныя навыкі дзякуючы выкарыстанню спецыяльнага пакрыцця | Складаныя вучэбныя дзеянні могуць быць падзелены на простыя і недоўгачасовыя практыкаванні, якія ўлічваюць індывідуальныя магчымасці вучняў |
| Палегчаная клавіятура | Палегчыць распазнаванне літар і выкарыстанне розных функцый клавіятуры | Палегчаныя ўмовы знаходжання і запамінання раздражняльніка |
| Маніпулятар «мыш» | Палегчыць кіраванне паказальнікам «мышы» | Ужыванне ўстройства не патрабуе асобай дакладнасці ў рухах рукі, кіраванне курсорам «мышы» палегчана шляхам падзелу працэсаў пошуку рысунка курсора і прывядзення яго ў рух |
| Сенсорны экран | Дазволіць вучням непасрэдна кіраваць інтэрфейсам камп'ютэра шляхам адчувальнай паверхні экрана | Устройства з'яўляецца найбольш простым у выкарыстанні для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю, бо яго функцыяніраванне заснавана на найпрасцейшых дзеяннях з боку школьніка |

Па меры авалодання вучнямі карыстальніцкімі ўменнямі і навыкамі рэкамендуецца выкарыстанне камп'ютэра не толькі на ўроках па прадмеце «Камп'ютэрная граматa», але і па іншых агульнаадукацыйных прадметах. Правядзенне такіх інтэграваных заняткаў будзе спрыяць аўтаматызацыі навыкаў вало-

дання камп'ютэрам і атрыманню вучнямі дадатковых ведаў па прадметах, якія спрыяюць іх сацыялізацыі, развіццю творчых здольнасцей, актывізацыі навучальнага працэсу.

Размеркаванне часу на вывучэнне матэрыялу з'яўляецца прыкладным. Настаўнік можа перараэмяркоўваць час на вывучэнне асобных тэм з улікам засваення школьнікамі праграмнага матэрыялу. Па кожнай тэме прадугледжаны кантрольныя заданні, вынікі выканання якіх паказваюць ступень авалодання вучнямі праграмным матэрыялам.

## XI КЛАС

**(35 гадзін)**

### Паняцце аб інфармацыі, спосабах яе атрымання і апрацоўкі (2 гадзіны)

Віды інфармацыі ў сучасным свеце. Тэкставая інфармацыя, спосабы яе апрацоўкі і захавання (кнігі, газеты, часопісы, запісы і інш.). Графічная інфармацыя, яе апрацоўка пры дапамозе розных выяўленчых сродкаў і спосабаў (выяўленчае мастацтва, фатаграфія) і захаванне ў выглядзе карцін, малюнкаў, скульптур, фотакартак і г. д. Гукавая інфармацыя, яе апрацоўка і захоўванне пры дапамозе магнітных стужак, кампакт-дыскаў і г. д. Відэаінфармацыя, яе апрацоўка пры дапамозе кіна- і відэатэхнікі і захаванне на кінаплёнках, відэакасетах, кампакт-дысках.

Тэлефон, тэлевізар, радыё, прайгравальнік як крыніцы інфармацыі.

Персанальны камп'ютэр як сродак атрымання, перадачы, перапрацоўкі і захоўвання тэкставай, графічнай, гукавой, відэаінфармацыі.

### Знаёмства з персанальным камп'ютэрам і яго кампанентамі (2 гадзіны)

Тэхніка бяспекі пры рабоце з персанальным камп'ютэрам. Правілы паводзін у камп'ютэрным класе. Гігіенічныя патрабаванні пры рабоце на камп'ютэры.

Асноўныя ўстройствы персанальнага камп'ютэра: манітор, клавіятура, сістэмны блок. Прызначэнне кожнага з устройстваў. Кнопка ўключэння-выключэння энергазабеспячэння.

Дадатковыя ўстройствы персанальнага камп'ютэра: маніпулятар «мыш», прынтэр, гукавыя калонкі. Іх прызначэнне.

***Практычныя заданні***: уключэнне і выключэнне камп'ютэра, перамяшчэнне паказальніка маніпулятара «мыш», завяршэнне сеанса работы з дапамогай маніпулятара «мыш».

### Рабочы стол Windows, маніпулятар «мыш», прыёмы работы з маніпулятарам «мыш» (4 гадзіны)

Від рабочага стала, знаёмства з элементамі рабочага стала Windows.

Асноўныя прыёмы работы з маніпулятарам «мыш»: перамяшчэнне паказальніка, выдзяленне аб'екта на рабочым стале, выкананне каманды меню шляхам хуткага націску і адпускання (пстрычкі) левай кнопкі «мышы»; выкананне асноўнага дзеяння з аб'ектам (запуск праграмы на выбар педагога) шляхам дзвюх пстрычак, выкананых з малым інтэрвалам часу; перамяшчэнне значка на рабочым стале з дапамогай націску і ўтрымання левай кнопкі маніпулятара «мыш».

***Практычныя заданні***: выкананне дзеянняў з дапамогай маніпулятара «мыш»: выдзяленне аб'екта, выкананне каманды меню, запуск праграмы, перамяшчэнне значкоў на рабочым стале. Камп'ютэрныя гульні, дзеянні ў якіх выконваюцца з дапамогай маніпулятара «мыш».

### Меню «Пуск». Стандартныя дадаткі, вокны Windows (6 гадзін)

Структура меню «Пуск», перамяшчэнне па меню, запуск праграмы з меню «Пуск» (калькулятар), вывучэнне прыёмаў работы са стандартным дадаткам «Калькулятор», закрыццё меню.

Знаёмства з вокнамі Windows (на прыкладзе папкі «Мой компьютер»), асноўныя элементы акна, згортванне, разгортванне, закрыццё, змяненне памеру, пракрутка акна.

***Практычныя заданні***: запуск праграмы з меню «Пуск», адкрыццё калькулятара, выкананне найпрасцейшых арыфметычных дзеянняў, выкананне аперацый з вокнамі.

### **Клавіятура. Прызначэнне груп клавіш** (4 гадзіны)

Групы клавіш клавіятуры. Алфавітныя і лічбавыя клавішы, іх размяшчэнне. Клавішы кіравання курсорам. Клавішы «Enter», «Shift». Малая лічбавая клавіятура.

Камп'ютэрныя гульні, дзеянні ў якіх выконваюцца з дапамогай клавіш клавіятуры.

***Практычныя заданні***: увод асобных слоў, сказаў, запіс лічбаў, перамяшчэнне курсора па тэксце.

### **Тэкставы рэдактар Microsoft Word** (10 гадзін)

Запуск праграмы Microsoft Word. Знаёмства з элементамі акна Microsoft Word: загаловак, панель інструментаў (стандартная), рабочае поле, паласа пракруткі.

Аперацыі з тэкстам: правілы набору тэксту (прапісная літара, знакі пунктуацыі, прабел паміж словамі, абзац, выдаленне сімвала справа (злева) ад курсора).

Рэдагаванне тэксту: перамяшчэнне па тэксце, устаўка сімвалаў у тэкст, выдзяленне слова, фрагментаў тэксту, капіраванне, перамяшчэнне фрагмента тэксту.

Фармаціраванне тэксту: памер і абрыс шрыфту, выраўноўванне абзацаў.

Захаванне дакумента, спосабы захавання дакумента. Друкаванне дакумента.

***Практычныя заданні***: увод тэксту, складанне спіса класа, практыкаванні на расстаўленне знакаў пунктуацыі ў тэксце, выдаленне знакаў, выкананне заданняў па беларускай мове і матэматыцы, рэдагаванне і фармаціраванне тэксту, захаванне дакумента, вывядзенне дакумента на друк.

### **Файлавая структура Windows. Праграма «Проводник»** (5 гадзін)

Файлы і папкі, імёны папак, стварэнне новых файлаў і папак, капіраванне і выдаленне файлаў і папак. Праграма «Проводник», акно праграмы, перамяшчэнне файлаў, папак, адкрыццё папкі «Мои документы» з дапамогай праграмы «Проводник».

***Практычныя заданні***: адкрыццё папак і файлаў (у тым ліку праз праграму «Проводник»), захаванне файлаў і папак на дыскету, кампакт-дыск, капіраванне, захаванне, выдаленне дакументаў.

### **Замацаванне пройдзенага матэрыялу** (2 гадзіны)

Замацаванне асноўных навыкаў работы на камп'ютэры, выкананне самастойных практычных заданняў (на выбар настаўніка).

ДА КАНЦА ГОДА ВУЧНІ

**В е д а ю ц ь:**

патрабаванні тэхнікі бяспекі пры рабоце з персанальным камп'ютэрам і правілы паводзін у камп'ютэрным класе;

назвы і прызначэнне розных устройстваў камп'ютэра;

паслядоўнасць уключэння і выключэння камп'ютэра;

асноўныя прыёмы работы з маніпулятарам «мыш»;

асноўныя элементы вокнаў Windows;

прызначэнне груп клавіш клавіятуры, прызначэнне клавіш «Enter», «Shift»;

парадак запуску праграмы Microsoft Word і стандартнага дадатку «Калькулятор»;

правілы набору і рэдагавання тэксту;

спосабы захавання дакументаў;

прызначэнне праграмы «Проводник».

**У м е ю ц ь:**

уключаць і выключаць камп'ютэр;

выконваць дзеянні з дапамогай маніпулятара «мыш»;

выдзяляць і перамяшчаць аб'екты на рабочым стале;

разгортваць, згортваць, закрываць вокны;

змяняць памер вокнаў;

запускаць праграмы з меню «Пуск»;

выконваць арыфметычныя дзеянні з дапамогай дадатку «Калькулятор»;

запускаць праграму Microsoft Word;

набіраць тэкст;

перамяшчацца па тэксце з дапамогай маніпулятара «мыш», клавіятуры, паласы пракруткі;

выдзяляць фрагмент тэксту з дапамогай маніпулятара «мыш»;

капіраваць фрагмент тэксту ў межах аднаго дакумента з дапамогай кнопкі «копировать» панелі інструментаў;

устаўляць папярэдне скапіраваны тэкст у дакумент;

выбіраць памер шрыфту;

выбіраць напісанне шрыфту (паўтлусты, курсіў, падкрэслены);
раўняць абзацы (па левым баку, па цэнтры, па правым баку, па шырыні);
захоўваць дакумент з дапамогай каманды «сохранить», з дапамогай кнопкі «сохранить» панелі інструментаў;
адкрываць папкі і файлы праз праграму «Проводник»;
перамяшчаць папкі з дапамогай праграмы «Проводник»;
адкрываць тэкставы дакумент з праграмы «Проводник»;
ствараць новыя папкі і файлы;
захоўваць файлы і папкі на дыскеце праз праграму «Проводник»;
выконваць з дапамогай тэкставага рэдактара пісьмовыя заданні па беларускай мове, матэматыцы;
выводзіць тэкставыя дакументы на друк.

## XII КЛАС

**(35 гадзін)**

### Аперацыйная сістэма Windows (паўтарэнне). Адладжванне Windows (6 гадзін)

Рабочы стол Windows, маніпулятар «мыш», прыёмы работы з маніпулятарам «мыш». Клавіятура. Перамяшчэнне па меню «Пуск», запуск праграм з меню «Пуск».

Асноўныя элементы вокнаў Windows, разгортванне і аднаўленне акна, згортванне і закрыццё, змяненне памеру, пракрутка акна.

Установка застаўкі экрана, установка фону экрана, адладжванне гадзін і календара, выбар мовы.

***Практычныя заданні***: самастойны запуск праграм, установка даты і часу, установка застаўкі і фону экрана і г. д.

### Файлавая структура Windows (4 гадзіны)

Праграма «Проводник», акно праграмы, перамяшчэнне папак у праграме «Проводник», адкрыццё папкі «Мои документы» з дапамогай праграмы «Проводник». Прагляд зместу папак у праграме «Проводник». Капіраванне і перамяшчэнне файлаў і папак у праграме «Проводник».

Выкарыстанне значка «Мой компьютер» для прагляду змесету цвёрдага дыска.

Выдаленне файлаў і папак, значок «Корзина», ачыстка «Корзины».

Правілы карыстання электроннымі носьбітамі (дыскета, кампакт-дыск і інш.). Чытанне і выдаленне файлаў і папак, змешчаных на электронных носьбітах.

Захаванне файлаў і папак на дыскету з дапамогай праграмы «Проводник». Захаванне файлаў і папак, змешчаных на электронных носьбітах, на цвёрды дыск.

Перайменаванне файлаў і папак.

***Практычныя заданні***: выдаленне файлаў, перайменаванне файлаў і папак, ачыстка «Корзины», захаванне файлаў і папак рознымі спосабамі і г. д.

### **Тэкставы рэдактар Microsoft Word** (8 гадзін)

Запуск праграмы Microsoft Word. Правілы набору тэксту. Рэдагаванне тэксту. Фармаціраванне і захаванне дакумента. Капіраванне і перамяшчэнне тэксту.

Параметры старонкі (палі, памер паперы), устаўка нумароў старонак, папярэдні прагляд, друкаванне дакумента.

Панелі інструментаў (стандартная, фармаціраванне, табліцы і межы).

Стварэнне маркіраваных і нумараваных спісаў.

Стварэнне табліцы, дабаўленне табліцы ў дакумент, фармаціраванне табліцы.

Размяшчэнне графікі ў дакументах: дабаўленне гатовага рысунка ў дакумент, дабаўленне аб'екта WordArt.

***Практычныя заданні***: увод тэксту, рэдагаванне тэксту, устаўка нумароў старонак, установка параметраў старонкі, стварэнне спісаў, стварэнне табліцы і яе ўстаўка ў дакумент, размяшчэнне графікі ў дакуменце і г. д.

### **Глабальная сетка Internet** (9 гадзін)

Паняцце аб глабальнай сетцы Internet. Запуск праграмы Internet Explorer. Пошукавыя сістэмы (на прыкладзе Rambler або Yandex). Пошук інфармацыі ў Internet, яе прагляд.

Захаванне Web-старонкі, прагляд захаванай Web-старонкі. Паняцце аб камп'ютэрных вірусах. Антывірусныя праграмы. Маральныя аспекты выкарыстання сеткі Internet.

***Практычныя заданні***: выхад у Internet, пошук неабходнай інфармацыі (на выбар настаўніка), друкаванне дакумента.

### **Электронная пошта** (6 гадзін)

Стварэнне паштовай скрыні на паштовым серверы. Стварэнне і адпраўка паведамленняў. Укладанне файла. Атрыманне паведамленняў па электроннай пошце, адказ на паведамленне. Прагляд укладзенага файла, яго захаванне.

***Практычныя заданні***: стварэнне ўласнай паштовай скрыні, адпраўка паведамлення, атрыманне і чытанне паведамленняў.

### **Замацаванне пройдзенага матэрыялу** (2 гадзіны)

Замацаванне асноўных навыкаў карыстання камп'ютэрам, выкананне самастойных практычных заданняў (на выбар настаўніка).

### ДА КАНЦА ГОДА ВУЧНІ

**В е д а ю ц ь:**

паслядоўнасць дзеянняў пры захаванні файлаў;
асноўныя аперацыі з тэкстам;
парадак дзеянняў пры стварэнні табліц;
парадак друкавання дакументаў;
парадак выхаду ў Internet;
парадак работы з электроннай поштай.

**У м е ю ц ь:**

працаваць у тэкставым рэдактары Microsoft Word;
устанаўліваць неабходныя панелі інструментаў і карыстацца імі (стандартная, фармаціраванне, табліцы і межы);
выконваць асноўныя аперацыі па рэдагаванні і фармаціраванні тэкставых дакументаў;
устанаўліваць параметры старонкі;
ствараць маркіраваныя і нумараваныя спісы;
ствараць табліцы, дабаўляць табліцы ў дакумент;

устаўляць гатовы рысунак у дакумент, дабаўляць аб’ект WordArt;

устанаўліваць фон і застаўкі экрана;

устанаўліваць дату і час;

выконваць дзеянні з файламі і папкамі (капіраванне, перамяшчэнне, захаванне, перайменаванне і інш.);

працаваць з электроннымі носьбітамі;

запускаць праграму Internet Explorer;

знаходзіць патрэбную інфармацыю ў сетцы Internet;

ствараць паштовую скрыню;

выконваць дзеянні з электроннай поштай (адпраўка паведамленняў, прыём і чытанне паведамленняў, захаванне).

# ХІМІЯ І ФІЗІКА Ў БЫЦЕ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дэфіцыт політэхнічных ведаў, уменняў і навыкаў абмяжоўвае магчымасці сацыяльнай адаптацыі вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Курс «Хімія і фізіка ў быце» накіраваны на фарміраванне сацыяльна значных ведаў і ўменняў, дазваляе звязаць вывучаемы матэрыял з жыццём, ужываць атрыманыя веды на практыцы і тым самым павысіць магчымасці сацыяльнай адаптацыі школьнікаў.

Змест курса складаюць звесткі аб некаторых уласцівасцях фізічных цел і рэчываў, працэсах, заканамернасцях, з якімі людзі сутыкаюцца ў побыце.

***Мэта*** курса — фарміраванне ведаў і ўменняў для павышэння сацыяльнай адаптацыі выпускнікоў школы.

Змест праграмы «Хімія і фізіка ў быце» арыентаваны на рэалізацыю наступных ***задач***:

- фарміраванне ў вучняў уяўленняў аб хімічных і фізічных з’явах, сустракаемых у побыце;
- фарміраванне ўменняў выкарыстоўваць атрыманыя веды ў паўсядзённым жыцці.

У праграме для кожнай тэмы вызначаны пытанні, якія трэба вывучыць, пералікі дэманстрацый і практычных работ. Размеркаванне часу па вучэбных тэмах з’яўляецца прыкладным.

Змест практычнай часткі вызначаюць:

- прыкладная скіраванасць (сувязь з паўсядзённай дзейнасцю чалавека);
- тэхнічная прастата (выкарыстанне замест рэактываў і хімічнага абсталявання тых рэчываў і прыстасаванняў, якія выкарыстоўваюцца ў побыце);
- экалагічная скіраванасць і бяспека.

Праграма рэалізуецца за 2 гады навучання. У першы год вывучаецца курс «Хімія ў быце» — 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень), на другі год — курс «Фізіка ў быце» — 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень).

# Хімія ў быце

**(35 гадзін)**

**Уводзіны** (1 гадзіна)

Прадмет хіміі. Кароткія звесткі з гісторыі хіміі.

**Хімія і яе значэнне ў жыцці чалавека** (2 гадзіны)

Значэнне хіміі ў жыцці і дзейнасці чалавека.

Уяўленні аб рэчывах і іх ролі ў жыцці чалавека. Паняцце аб небяспецы таксічных, гаручых і выбуханебяспечных рэчываў. Паняцце аб некаторых фізіка-хімічных уласцівасцях рэчываў: растварэнне, плаўленне, кіпенне, крышталізацыя, фільтраванне, выпарванне. Праблемы бяспечнага выкарыстання хімічных рэчываў.

Паняцце аб экалагічных праблемах, звязаных з хімічным забруджваннем навакольнага асяроддзя.

***Дэманстрацыі***

Растварэнне, фільтраванне, выпарванне, плаўленне, кіпенне.

***Практычныя работы***

Правілы бяспечных паводзін з хімічнымі рэчывамі (экскурсія ў кабінет хіміі агульнаадукацыйнай школы).

**Хімія ў барацьбе з хваробамі** (3 гадзіны)

Хімія і здароўе.

Паняцце аб прызначэнні і спосабах ужывання лекавых сродкаў. Формы лекавых сродкаў. Захоўванне лекавых сродкаў у побыце.

Паняцце аб вітамінах і іх значэнні для здароўя чалавека.

Паняцце аб мінеральных водах.

***Дэманстрацыі***

Розныя формы лекавых сродкаў: мазі, таблеткі, парашкі і г. д.

***Практычныя работы***

Вывучэнне інструкцыі на ўпакоўцы лекавага сродку (захоўванне, прыём).

### **Бытавая хімія** (8 гадзін)

Сродкі бытавой хіміі. Правілы бяспечнага выкарыстання сродкаў бытавой хіміі.

Пральныя парашкі і іх віды. Хімічныя адбельвальнікі, апаласквальнікі для бялізны, іх віды і ўласцівасці.

Сродкі, якія чысцяць. Іх віды і прызначэнне. Сродкі для мыцця посуду, шкла, ванны, туалета, кафлі, газавых і электрычных пліт.

Сродкі для дэзінфекцыі.

Сродкі для знішчэння шкодных насякомых, грызуноў.

***Дэманстрацыі***

1. Сродкі бытавой хіміі.
2. Вывядзенне плям сродкамі бытавой хіміі.

***Практычныя работы***

1. Вывучэнне этыкетак на сродках бытавой хіміі (правілы карыстання і меры бяспекі).
2. Вывядзенне плям сродкамі бытавой хіміі.
3. Развядзенне пральных парашкоў і апаласквальнікаў для бялізны.

### **Касметычная хімія** (4 гадзіны)

Касметычная хімія.

Парфума, адэкалоны, духмяныя воды. Мужчынская і жаночая парфумерыя. Араматэрапія.

Мылы і іх віды. Шампунь. Віды шампуняў. Крэмы. Віды крэмаў. Сродкі догляду зубоў. Іх віды і прызначэнне.

***Дэманстрацыі***

Мыла, шампунь, крэм, цені, пудра, сродкі догляду зубоў і г. д. (узоры).

***Практычныя работы***

Вывучэнне этыкетак на касметычных таварах (правілы карыстання і меры бяспекі).

### **Хімія і харчаванне чалавека** (6 гадзін)

Хімія і ежа. Паняцце аб тлушчах, бялках, вугляводах і іх пажыўнай каштоўнасці. Збалансаванае харчаванне. Харчовыя

дабаўкі і іх значэнне. Наяўнасць вітамінаў у прадуктах харчавання.

Якасць ежы і тэрміны захоўвання харчовых прадуктаў.

Вада. Значэнне вады ў жыцці чалавека.

Паваранная соль, яе значэнне. Ёдаваная соль.

Інгрэдыенты прадуктаў харчавання.

Цукар. Мёд і варэнне. Глюкоза. Воцат і сода.

***Дэманстрацыі***

1. Дэнатурацыя бялкоў пры кіпячэнні або дзеянні лімоннага соку.

2. Вызначэнне асяроддзя яблычнага соку, раствора соды, мыла, воцату, вады.

***Практычныя работы***

1. Вывучэнне складу прадуктаў харчавання (па этыкетках), расшыфроўка кода харчовых дабавак.

2. Атрыманне карамелі.

3. Гашэнне соды воцатам.

## **Хімія ў земляробстве** (3 гадзіны)

Уяўленне аб хімічных элементах, неабходных для развіцця раслін. Удабрэнні і іх ужыванне ў сельскай гаспадарцы. Спосабы ўнясення ўдабрэнняў.

Захоўванне ўдабрэнняў у бытавых умовах.

Ядахімікаты.

Бяспека пры рабоце з удабрэннямі і ядахімікатамі.

Атрыманне экалагічна чыстых прадуктаў харчавання.

***Практычныя работы***

1. Вывучэнне інструкцыі па ўжыванні ўдабрэнняў для пакаёвых раслін.

2. Ужыванне ўдабрэнняў для пакаёвых раслін.

## **Хімія вакол нас** (6 гадзін)

Прыродныя крыніцы хімічных рэчываў.

Матэрыялы, атрыманыя хімічным шляхам: пластмаса, гума, клей і г. д.

Тканіны натуральныя, штучныя. Віды штучных тканін.

Металы. Карозія металаў. Спосабы абароны ад карозіі.

Будаўнічыя матэрыялы: кераміка, цэгла, вапна, цэмент, бетон, шкло.

Рэчывы, якія выкарыстоўваюцца ў паліграфіі, жывапісе, скульптуры. Папера і алоўкі.

***Дэманстрацыі***

1. Узоры тканін.
2. Узоры пластмас, сінтэтычных каўчукаў і сінтэтычных валокнаў (калекцыі).
3. Узоры вырабаў з металаў, схільных да карозіі.
4. Узаемадзеянне цэменту і вады.

***Практычныя работы***

1. Вызначэнне віду тканіны па бірках для вопраткі.
2. Падрыхтоўка крухмальнага і жэлацінавага клею.
3. Падрыхтоўка шпалернага клею (па інструкцыі на ўпакоўцы).

### **Паўтарэнне** (2 гадзіны)

## Фізіка ў быце
**(35 гадзін)**

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

Фізіка — навука аб прыродзе. Выкарыстанне фізічных ведаў у практычнай дзейнасці. Фізіка — аснова тэхнікі.

### **Фізічныя целы. Фізічныя велічыні**
(4 гадзіны)

Фізічныя целы. Пастаянства аб'ёму і формы цвёрдага цела. Пастаянства аб'ёму вадкасцей. Аб'ём газападобных цел, змяненне іх формы і аб'ёму.

Вымярэнне фізічных велічынь. Вымярэнне лінейных памераў цел. Адзінкі вымярэння даўжыні. Вымяральныя прыборы: лінейка, штангенцыркуль, мікраметр.

Вымярэнне плошчы цел. Адзінкі вымярэння плошчы.

Адзінкі вымярэння аб'ёму цела. Вымяральны прыбор — мензурка. Вымярэнне аб'ёму сыпкіх цел.

***Франтальныя лабараторныя работы***

1. Вызначэнне цаны дзялення шкалы вымяральнага прыбора.

2. Вымярэнне лінейных памераў цел з дапамогай лінейкі, штангенцыркуля, мікраметра.

3. Вымярэнне аб'ёму цел няправільнай формы з дапамогай мензуркі.

4. Вымярэнне плошчы прадметаў няправільнай формы (з дапамогай міліметровай паперы).

5. Вымярэнне росту чалавека, акружнасці яго галавы, адлегласці паміж вачамі.

### **Будова рэчыва** (2 гадзіны)

Малекулы і атамы. Узаемадзеянне і рух малекул. Размяшчэнне малекул у газах, вадкасцях, цвёрдых целах. Броўнаўскі рух.

Дыфузія. Прыклады дыфузіі ў побыце (афарбоўванне бялізны пры мыцці, засольванне агуркоў, заварка гарбаты, распаўсюджванне паху і інш.). Агрэгатныя станы рэчываў.

***Дэманстрацыі***

1. Дыфузія.

2. Розныя агрэгатныя станы рэчываў.

### **Рух і ўзаемадзеянне цел** (8 гадзін)

Механічны рух. Віды рухаў: паступальны і вярчальны.

Раўнамерны і нераўнамерны рух. Шлях. Адзінкі вымярэння шляху. Хуткасць руху. Адзінкі вымярэння хуткасці. Сярэдняя хуткасць руху. Спідометр.

Маса цела. Адзінкі вымярэння масы. Вымярэнне масы на рычажных вагах. Гравітацыйнае ўзаемадзеянне. Сіла цяжару. Вага цела.

Сіла трэння. Залежнасць сілы трэння ад прыціскальнай сілы і якасці апрацоўкі паверхняў. Станоўчая і адмоўная роля трэння ў побыце. Спосабы павелічэння і памяншэння сілы трэння.

Інерцыя. Праяўленне інерцыі ў побыце (насаджванне малатка на ручку, выбіванне пылу, паласканне бялізны і інш.).

Ціск вадкасцей. Перадача ціску вадкасцямі (гідраўлічны тормаз, гідраўлічны дамкрат, гідраўлічны прэс).

Сазлучаныя сасуды, іх ужыванне (лейка, чайнік, фантан, вадаправод, шлюз).

Ціск газу, перадача ціску газамі. Выкарыстанне ціску газаў у адбойных малатках, балонах з кіслародам для зваркі, балонах аквалангіста, пнеўматычных тармазах.

Паветраная абалонка Зямлі. Атмасферны ціск. Выкарыстанне атмасфернага ціску ў побыце (мыльніца з прысоскамі, дзеянне вантуза, медыцынскія банкі і інш.). Вымярэнне атмасфернага ціску з дапамогай барометра-анероіда. Атмасферны ціск і надвор'е. Уплыў змянення атмасфернага ціску на самаадчуванне чалавека.

***Дэманстрацыі***

1. Розныя віды руху цела.
2. Сазлучаныя сасуды.

***Франтальныя лабараторныя работы***

1. Вымярэнне масы на рычажных вагах.
2. Вывучэнне трэння слізгацення.

### **Цеплавыя з'явы** (6 гадзін)

Цеплавыя з'явы ў прыродзе і іх значэнне ў жыцці чалавека, жывёл і раслін. Цеплавое пашырэнне цвёрдых цел, вадкасцей і газаў. Тэмпература. Тэрмометр. Вымярэнне тэмпературы. Улік цеплавога пашырэння цел у побыце і ў тэхніцы.

Віды цеплаперадачы: цеплаправоднасць, канвекцыя, выпраменьванне. Прыклады выкарыстання і ўлік цеплаперадачы ў побыце. Эканомія цеплавой энергіі ў побыце.

Агрэгатныя пераходы (плаўленне, крышталізацыя, параўтварэнне, кандэнсацыя). Тэмпература плаўлення і яе ўлік у тэхніцы і ў побыце. Кіпенне вадкасці. Тэмпература кіпення. Вільготнасць паветра. Прыборы для вымярэння вільготнасці паветра. Выкарыстанне з'яў выпарэння і кандэнсацыі ў тэхніцы і ў побыце (ачыстка рэчываў, сушыльная машына). Атмасферныя з'явы: дождж, снег, град.

Гарэнне. Энергія, якая выдзяляецца пры згаранні паліва. Экалагічныя праблемы энергетыкі.

***Дэманстрацыі***

1. Канвекцыя ў вадкасцях.
2. Плаўленне лёду.
3. Кіпенне вады.

***Франтальныя лабараторныя работы***

Вывучэнне ўстройства і прынцыпу дзеяння тэрмометра, вымярэнне тэмпературы вадкасці.

### **Электрычныя з’явы** (7 гадзін)

Электрычныя з’явы ў прыродзе і іх значэнне ў жыцці чалавека, жывёл. Два роды электрычных разрадаў. Электрызацыя цел. Спосабы электрызацыі. Узаемадзеянне зараджаных цел. Праваднікі і дыэлектрыкі.

Электрычны ток. Умовы існавання электрычнага току. Крыніцы электрычнага току. Дзеянне электрычнага току. Выкарыстанне цеплавога дзеяння электрычнага току ў побыце.

Электрычны ланцуг. Электрычнае супраціўленне. Паслядоўнае і паралельнае злучэнне праваднікоў. Бытавыя электрычныя прыборы: электралямпы напальвання, электранагравальныя прыборы, пыласос, электрадрэль, вентылятар, пральная машына, халадзільнік і інш. Тэхніка бяспекі пры рабоце з электрычнымі прыборамі. Схема электрычнай праводкі кватэры.

Кароткае замыканне. Прызначэнне засцерагальнікаў.

Работа і магутнасць электрычнага току. Адзінкі работы і магутнасці. Вызначэнне магутнасці бытавых прыбораў па тэхнічным пашпарце. Эканомія электраэнергіі.

***Дэманстрацыі***

1. З’явы электрызацыі.
2. Найпрасцейшы электрычны ланцуг.
3. Паслядоўнае злучэнне праваднікоў.
4. Паралельнае злучэнне праваднікоў.

***Эксперыментальныя заданні***

1. Крыніцы сілкавання ў электрычных прыборах, іх замена. Улік палярнасці клем.

2. Вызначэнне магутнасці бытавых прыбораў па тэхнічным пашпарце.

3. Здыманне паказанняў лічыльніка і разлік кошту электраэнергіі.

4. Вывучэнне работы гірлянды (паслядоўнае злучэнне лямпачак).

### **Электрамагнітныя з’явы** (2 гадзіны)

Магнітныя з’явы. Пастаянныя магніты. Магнітнае поле Зямлі.

***Дэманстрацыі***

1. Магнітная стрэлка.
2. Узаемадзеянне магнітаў.

***Франтальныя лабараторныя работы***

Вывучэнне пастаяннага магніта.

### **Светлавыя з’явы** (3 гадзіны)

Крыніцы святла (натуральныя і штучныя, цеплавыя і люмінесцэнтныя). Лінза. Збіральная і рассейвальная лінзы. Вокааптычная сістэма. Зрок чалавека і жывёл. Дэфекты зроку. Акуляры. Лупа.

Аптычныя прыборы: фотаапарат, лупа і мікраскоп. Інфрачырвонае і ўльтрафіялетавае выпраменьванне. Ужыванне гэтых відаў выпраменьвання. Рэнтгенаўскае выпраменьванне. Рэнтгенаўскія промні ў медыцынскай практыцы і на вытворчасці.

***Дэманстрацыі***

1. Розныя крыніцы святла.
2. Аптычныя прыборы.

***Франтальныя лабараторныя работы***

Вывучэнне лупы.

### **Паўтарэнне** (2 гадзіны)

# ЭЛЕМЕНТЫ ЗАМЕЖНАЙ (АНГЛІЙСКАЙ) МОВЫ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасным свеце веданне замежных моў дазваляе чалавеку быць паспяховым у розных сферах дзейнасці. Акрамя прафесійнай падрыхтоўкі і вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў важна ўмець размаўляць з людзьмі з розных краін.

Для вучняў дапаможных школ арганізуюцца аздараўленчыя паездкі ў розныя краіны свету. Вопыт работы шэрагу спецыяльных установ адукацыі паказвае, што, трапляючы ў іншае моўнае асяроддзе, вучні з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю здольныя авалодаць навыкамі выкарыстання элементаў замежнай мовы ў розных сітуацыях зносін.

Праграма вызначае той мінімум ведаў і ўменняў, які дазволіць вучням на канчатковым этапе навучання авалодаць элементарнымі навыкамі выкарыстання замежнай (англійскай) мовы ва ўмовах знаходжання за мяжой, пры рабоце з камп'ютэрам і г. д.

Вучэбны прадмет «Элементы замежнай (англійскай) мовы» прадугледжвае фарміраванне ў вучняў 1-га аддзялення дапаможнай школы элементарных ведаў і ўменняў выкарыстоўваць замежную мову ў розных сферах жыццядзейнасці.

Змест праграмы арыентаваны на рэалізацыю наступных ***задач***:

- ✦ фарміраванне цікавасці да вывучэння замежнай мовы вучнямі;
- ✦ фарміраванне навыкаў разумення простых слоў, сказаў на англійскай мове;
- ✦ засваенне лексічных адзінак, неабходных для ажыццяўлення зносін, у межах праграмнай тэматыкі;
- ✦ фарміраванне ўменняў граматычна правільна будаваць простыя сказы;
- ✦ фарміраванне камунікатыўных уменняў у межах праграмнай тэматыкі;

- ✦ развіццё пазнавальных працэсаў (увагі, слыхавай і зрокавай памяці, наглядна-вобразнага і слоўна-лагічнага мыслення, уяўлення і г. д.).

Навучанне замежнай мове разлічана на два гады. Вызначаны патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці і прадметна-тэматычны змест. У кожнай тэме выдзелены прыкладны лексічны і граматычны матэрыял, арыентаваны на авалоданне элементарнымі навыкамі пабудовы сцвярджальных, адмоўных і пытальных сказаў.

Асноўнымі для засваення з’яўляюцца тэмы «Знаёмства», «Прадметы вакол нас», «Знешнасць», «Харчаванне», «Месца жыхарства», «Што я магу рабіць», «Святы», «Мае захапленні». Тэмы «Працоўны дзень», «Камп’ютэр, Інтэрнет», «Мае пачуцці», «Здароўе», пазначаныя зорачкай (*), могуць вывучацца дадаткова ў залежнасці ад індывідуальных асаблівасцей вучняў.

Тэма «Знаёмства» мае на мэце авалоданне лексічным запасам і граматычнымі канструкцыямі, якія дазваляюць паведаміць мінімальны аб’ём інфармацыі аб сабе, задаць пытанні, якія цікавяць.

Тэмы «Прадметы вакол нас» і «Знешнасць» арыентаваны на фарміраванне ўменняў апісваць навакольныя прадметы, сябе і іншых, задаваць пытанні аб знешнасці.

Пры вывучэнні тэмы «Харчаванне» фарміруюцца ўменні распавядаць аб сваіх перавагах, апісваць смакавыя якасці ежы.

Выконваючы заданні па тэме «Працоўны дзень», школьнікі вучацца распавядаць і распытваць аб абавязках, паўсядзённых дзеяннях.

У XII класе пералічаныя тэмы пашыраюцца, дадаюцца новыя аспекты вывучэння. Тэма «Святы» дапаўняе тэму «Харчаванне», мае на мэце расказ аб арганізацыі святочнага вечара. Новыя тэмы «Мае захапленні», «Мае пачуцці», «Што я магу рабіць» пашыраюць і дапаўняюць адна адну, дазваляюць не толькі падзяліцца з суразмоўцам нейкай інфармацыяй, але і выказаць свае адносіны да яе. Тэма «Месца жыхарства» мае на мэце фарміраванне ўменняў называць свой адрас, задаваць пытанні аб месцазнаходжанні розных прадметаў і г. д.

Курс «Элементы замежнай (англійскай) мовы» не прадугледжвае навучанне чытанню і пісьму на англійскай мове. Пры засваенні матэрыялу варта выкарыстоўваць нагляднасць. Важ-

ным элементам у засваенні замежнай мовы з'яўляецца выкарыстанне сюжэтна-ролевых гульняў, гульняў-драматызацый, пабудова розных сітуацый зносін, што дазволіць зацікавіць вучняў і забяспечыць эфектыўнасць навучання.

Педагогу таксама неабходна звяртаць увагу на вымаўленне некаторых гукаў і гукаспалучэнняў, якія адрозніваюцца ў рускай і англійскай мовах.

# XI КЛАС

**(35 гадзін)**

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Успрыманне і разуменне маўлення на слых**

Вучні павінны разумець інструкцыі, асобныя словы і простыя сказы ў межах праграмнага матэрыялу ў прад'яўленні настаўніка.

**Маўленне**

***Дыялагічнае маўленне.*** Вучні павінны абменьвацца рэплікамі ў межах тэматыкі навучальнай праграмы для дадзенага этапу навучання.

Прыкладная колькасць рэплік на кожнага суразмоўцу — 1—2.

***Маналагічнае маўленне.*** Вучні павінны ўмець расказваць пра сябе, называць асноўныя прадукты харчавання, апісваць прадметы, людзей, свой працоўны дзень, дзеянні з камп'ютэрам.

Прыкладны аб'ём выказванняў — 2—3 фразы.

## ПРАДМЕТНА-ТЭМАТЫЧНЫ ЗМЕСТ

Знаёмства. Прадметы вакол нас. Знешнасць. Харчаванне. Працоўны дзень. Камп'ютэр, Інтэрнэт.

### Т э м а 1. **Знаёмства**

**Лексіка**

Назоўнікі, якія абазначаюць людзей: хлопчык *(a boy)*, дзяўчынка *(a girl)*, мужчына *(a man)*, жанчына *(a woman)*, бацьк-

ка *(a father)*, маці *(a mother)*, дзядуля *(a grandfather)*, бабуля *(a grandmother)*, брат *(a brother)*, сястра *(a sister)*, дзядзька *(an uncle)*, цётка *(an aunt)*, кузен/кузіна *(a cousin)*, сябар *(a friend)*, настаўнік *(a teacher)*.

Назвы краін: Рэспубліка Беларусь (Беларусь) *(Belarus)*, Польшча *(Poland)*, Расія *(Russia)*, Украіна *(the Ukraine)*, Германія *(Germany)*, Італія *(Italy)*, ЗША *(the USA)* і інш. Назвы сталіц і вядомых гарадоў: Мінск *(Minsk)*, Варшава *(Warsaw)*, Масква *(Moscow)*, Кіеў *(Kiev)*, Берлін *(Berlin)*, Рым *(Rome)*, Вашынгтон *(Washington)* і інш.

Назвы частак сутак: раніца *(morning)*, дзень *(afternoon, day)*, вечар *(evening)*, ноч *(night)*.

Лічэбнікі ад 0 да 20 *(zero, one, two, three, four, five, six, seven, eight, nine, ten, eleven, twelve, thirteen, fourteen, fifteen, sixteen, seventeen, eighteen, nineteen, twenty)*.

Словы прывітання і развітання: «Прывітанне!» *(Hi! Hello!)*, «Добрай раніцы! Добры дзень! Добры вечар!» *(Good morning! Good afternoon! Good evening!)*, «Да пабачэння!» *(Good bye!)*, «Убачымся!» *(See you!)*.

**Граматыка**

Асабістыя займеннікі: я *(I)*, ты *(you)*, ён *(he)*, яна *(she)*, яно *(it)*, мы *(we)*, яны *(they)*.

Стварэнне і ўжыванне множнага ліку назоўнікаў.

Практычнае выкарыстанне прыслоўяў: што? *(what?)*, як? *(how?)*, дзе? *(where?)*, калі? *(when?)* і прыназоўнікаў: у *(in)*, да *(to)*, у, каля *(at)* у размове.

Практычнае выкарыстанне дзеяслова «быць» *(to be)*: *am, is, are*.

Паведамленне суразмоўцу інфармацыі аб сабе: імя, прозвішча, узрост, месца жыхарства *(I live in ... . My name is ... .)*.

Фарміраванне ўменняў задаваць пытанні і адказваць на іх: *What is your (family) name? How old are you? Where are you from? How are you? My name is ... . I'm ... (six). I'm from ... .*

## Т э м а 2. **Прадметы вакол нас**

**Лексіка**

Назоўнікі, якія абазначаюць прадметы паўсядзённага карыстання:

мэбля *(furniture)*: стол *(a table)*, крэсла *(a chair)*, канапа *(a sofa)*, ложак *(a bed)*, шафа *(a wardrobe)*;

прадметы асабістай гігіены: насоўка *(a handkerchief)*, расчоска *(a comb)*, зубная шчотка *(a toothbrush)*, зубная паста *(toothpaste)*, мыла *(soap)*, шампунь *(shampoo)*;

посуд *(tableware)*: шклянка *(a glass)*, кружка *(a cup)*, талерка *(a plate)*, лыжка *(a spoon)*, відэлец *(a fork)*, нож *(a knife)*;

школьныя прылады: ручка *(a pen)*, аловак *(a pencil)*, сшытак *(a notebook)*, школа *(school)*, сумка *(a bag)*, званок *(a bell)*, лінейка *(a ruler)*, сцірка *(a rubber)*;

прадметы побыту: тэлевізар *(a TV set)*, тэлефон *(a phone)*, люстэрка *(a mirror)*, ваза *(a vase)*.

Дзеясловы, звязаныя з выкананнем паўсядзённых дзеянняў: чытаць *(to read)*, пісаць *(to write)*, сядзець *(to sit)*, ісці *(to go)*, глядзець *(to watch)*, бачыць *(to see)*, мыцца *(to wash)*, прымаць душ *(to shower)*, чысціць зубы *(to brush teeth)*, расчэсваць валасы *(to comb hair)*, есці *(to eat)*, піць *(to drink)*.

Прыметнікі, якія абазначаюць ***колер***: карычневы *(brown)*, чырвоны *(red)*, блакітны *(blue)*, чорны *(black)*, зялёны *(green)*, жоўты *(yellow)*, аранжавы *(orange)*, ружовы *(pink)*, белы *(white)*, шэры *(grey)* і г. д.; ***форму***: круглы *(round)*, авальны *(oval)*, квадратны *(square)*, трохкутны *(triangular)*; ***велічыню***: доўгі *(long)*, кароткі *(short)*, шырокі *(wide)*, вузкі *(narrow)*, вялікі *(big)*, маленькі *(small)*.

**Граматыка**

Выкарыстанне дзеяслова «мець» *to have (haven't)* у простых сказах.

Займеннік *it*. Выкарыстанне канструкцыі *It is ...* . Стварэнне пытальных сказаў з займеннікам *it (Is it a table?)* Сцвярджальная і адмоўная формы адказу: *Yes, it is. No, it is not.*

Выкарыстанне прыназоўнікаў: на *(on)*, у *(in)*, пад *(under)* для абазначэння месцазнаходжання прадметаў.

Стварэнне параўнальнай ступені прыметнікаў *(comparative degree)* з дапамогай *-er, more*.

Фарміраванне ўменняў задаваць пытанні і адказваць на іх:
*What's this? — It's ... . What colour ... ? It's ... .*
*Have you a ... ? I have a ... . I haven't a ... .*
*Where is the pen? The pen is ... .*

## Т э м а 3. **Знешнасць**

**Лексіка**

Назвы частак цела: галава *(a head)*, валасы *(hair)*, вуха *(an ear)*, твар *(a face)*, шыя *(a neck)*, тулава *(a body)*, рукі *(arms)*, плечы *(shoulders)*, далонь *(a palm)*, кісць *(a hand)*, ногі *(legs)*. Назвы частак твару: вочы *(eyes)*, рот *(a mouth)*, вусны *(lips)*, нос *(a nose)*, шчокі *(cheeks)*.

Назвы прадметаў вопраткі *(clothes)*: сукенка *(a dress)*, кашуля *(a shirt)*, штаны *(trousers)*, спадніца *(a skirt)*, шорты *(shorts)*, майка *(a T-shirt)*, шкарпэткі *(socks)*, світэр *(a sweater)*, паліто *(a coat)*, туфлі *(shoes)*, чаравікі *(boots)* і г. д.

Прыметнікі, якія выкарыстоўваюцца для апісання знешнасці: прыгожы *(beautiful)*, прывабны *(attractive)*, стройны *(slim)*, худы *(skinny)*, поўны *(fat)*, доўгі *(long)*, кароткі *(short)*, высокі *(tall)*, нізкі *(short)*, светлы *(fair)*, цёмны *(dark)*.

**Граматыка**

Ужыванне прыналежных займеннікаў: мой *(my)*, твой, ваш *(your)*, яго *(his)*, яе *(her)*, яго, яе *(its)*, наш *(our)*, іх *(their)*.

Выкарыстанне прыналежнага склону назоўнікаў (*Mother's name, sister's name* і г. д.).

Ужыванне дзеяслова *to be* ў сцвярджальных, адмоўных і пытальных сказах *(Is it ... ? Are you ... ? What colour are your eyes?)*.

Ужыванне простых сказаў з выкарыстаннем канструкцый *This is ... . That is ... . These are ... . Those are ... .*

## Т э м а 4. **Харчаванне**

**Лексіка**

Назоўнікі, якія абазначаюць назвы розных прадуктаў харчавання:

гароднiна *(vegetables)*: бульба *(potatoes)*, морква *(carrot)*, цыбуля *(onion)*, капуста *(cabbage)*, агурок *(cucumber)*, памідор *(tomato)*, перац *(pepper)*;

садавіна *(fruit)*: яблык *(an apple)*, груша *(a pear)*, банан *(a banana)*, ананас *(a pineapple)*, персік *(a peach)*, апельсін *(an orange)*, кавун *(a watermelon)*;

ягады *(berries)*: вішні *(cherries)*, клубніцы *(strawberries)*, вінаград *(grapes)*, чарніцы *(bilberries)*.

Назоўнікі, якія абазначаюць назвы напояў: вада *(water)*, малако *(milk)*, гарбата *(tea)*, кава *(coffee)*, сок *(juice)*.

Назоўнікі, якія абазначаюць ***час прыёму ежы***: сняданак *(breakfast)*, другі сняданак *(lunch)*, абед *(dinner)*, вячэра *(supper)*; ***стравы***: суп *(soup)*, аўсяная каша *(porridge)*, салата *(salad)* і інш.

Прыметнікі, якія абазначаюць ***якасць***: свежы *(fresh)*, добры *(good)*, сапсаваны *(bad)*, карысны *(healthy)*, гарачы *(hot)*, халодны *(cold)*; ***смак***: смачны *(tasty)*, салодкі *(sweet)*, салёны *(salty)*, кіслы *(sour)*, горкі *(bitter)*, прыемны *(nice)*.

Дзеясловы, якія абазначаюць дзеянні, звязаныя з прыняццем ежы: есці *(to eat)*, гатаваць *(to cook)*, спрабаваць *(to taste)*, снедаць *(to have breakfast)*, абедаць *(to have lunch/to have dinner)*, вячэраць *(to have supper)*, жадаць *(to want)*, падабацца *(to like)* і г. д.

Выкарыстанне выразаў часу: раніцай *(in the morning)*, днём *(in the afternoon)*, увечары *(in the evening)*, уначы *(at night)*.

**Граматыка**

Ужыванне простага цяперашняга часу.

Выкарыстанне ў сказах прыслоўяў: часта *(often)*, заўсёды *(always)*, часам *(sometimes)*, ніколі *(never)*, звычайна *(usually)*.

Выкарыстанне канструкцый *What do you like? I like … . I don't like … . Do you like … ?*

### *Т э м а 5. **Працоўны дзень**

**Лексіка**

Выразы, якія абазначаюць паўсядзённыя дзеянні: рана ўставаць *(to get up early)*, запраўляць пасцель *(to make one's bed)*, расчэсваць валасы *(to comb)*, чысціць зубы *(to brush one's teeth)*, садзіцца ў аўтобус/тралейбус/трамвай *(to take a bus/trolleybus/tram)*, вучыцца *(to study)*, ісці ў школу *(to go to school)*, мыць посуд *(to wash dishes)*, падмятаць падлогу *(to sweep the floor)*, класціся спаць *(to go to bed)*, рабіць хатнюю работу *(to do homework)*, гатаваць *(to cook)*, выносіць смецце *(to take the garbage out)*.

Лічэбнікі ад 0 да 60.

Назвы дзён тыдня: *Monday, Tuesday, Wednesday, Thursday, Friday, Saturday, Sunday*.

**Граматыка**

Сказы з выкарыстаннем простага цяперашняга часу з апісаннем дзеянняў, якія здзяйсняюцца штодня.

Выкарыстанне ў сказах прыслоўяў: часта *(often)*, заўсёды *(always)*, часам *(sometimes)*, ніколі *(never)*, звычайна *(usually)*.

Стварэнне дзеясловаў 3-ай асобы адзіночнага ліку з дапамогай *-s, -es (to work — he works, to do — he does)*.

### *Т э м а 6. **Камп'ютэр, Інтэрнет**

**Лексіка**

Часціны мовы, якія выкарыстоўваюцца пры апісанні работы на камп'ютэры:

назоўнікі: камп'ютэр *(a computer)*, экран (манітор) *(a screen)*, клавіятура *(a keyboard)*, мыш *(a mouse)*, прынтэр *(a printer)*, Web-сайт *(a site)*, рысунак *(an image)*, праграма *(a programme)*;

дзеясловы: загрузіць *(to download)*, увайсці *(to enter)*, злучыцца *(to connect)*, друкаваць *(to print)*, капіраваць *(to copy)*, захаваць *(to save)*, адкрыць *(to open)*, націснуць *(to click)*, выкарыстаць *(to use)*, выдаліць *(to delete)* і г. д.

Устойлівыя выразы: гуляць у камп'ютэрныя гульні *(to play computer games)*, уключыць/выключыць *(to switch on/off)*, працаваць на камп'ютэры *(to work on the computer)*, захаваць тэкст *(to save a text)*, выйсці ў Інтэрнет *(to log on the net)*, паштовая скрыня *(a mailbox)* і інш.

**Граматыка**

Паўтарэнне: дзеяслоў *to be*, просты цяперашні час, асабістыя і прыналежныя займеннікі, множны лік назоўнікаў.

Простыя апавядальныя сказы.

# XII КЛАС

**(35 гадзін)**

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Успрыманне і разуменне маўлення на слых**

Вучні павінны разумець інструкцыі, асобныя словы і простыя сказы ў межах праграмнага матэрыялу ў прад'яўленні настаўніка.

**Маўленне**

***Дыялагічнае маўленне.*** Вучні павінны абменьвацца рэплікамі ў межах тэматыкі вучэбнай праграмы для дадзенага этапу навучання.

Прыкладная колькасць рэплік на кожнага суразмоўніка — 2—3.

***Маналагічнае маўленне.*** Вучні павінны ўмець расказваць аб сваіх месцы жыхарства, самаадчуванні, аб тым, што ўмеюць рабіць, апісваць святочны вечар, выказвацца аб тым, чаму аддаюць перавагу, выяўляць свае эмацыянальныя адносіны да чаго-небудзь.

Прыкладны аб'ём выказванняў — да 4 фраз.

## ПРАДМЕТНА-ТЭМАТЫЧНЫ ЗМЕСТ

Месца жыхарства. Што я магу рабіць. Святы. Мае захапленні. Мае пачуцці. Здароўе.

### Тэма 1. Месца жыхарства

**Лексіка**

Паўтарэнне вывучаных слоў, якія абазначаюць прадметы; прыметнікаў, якія абазначаюць колер, форму, велічыню прадметаў.

Назоўнікі, якія абазначаюць:

населены пункт: горад *(a city)*, вёска *(a village)*, вуліца *(a street)*;

установы сацыяльнага абслугоўвання: аптэка *(a chemist's shop/a pharmacy)*, пошта *(a post-office)*, вакзал *(a railway station)*, тэатр *(a theatre)*, кінатэатр *(a cinema)* і інш.;

транспарт: аўтобус *(a bus)*, тралейбус *(a trolleybus)*, метро *(an underground/a subway)*, таксі *(a taxi)*, цягнік *(a train)*, самалёт *(a plane)*;

памяшканне і яго часткі: будынак *(a building)*, кватэра *(a flat)*, пакой *(a room)*, акно *(a window)*, дзверы *(a door)*, гасціная, зала *(a living room)*, ванная *(a bathroom)*, туалет *(a toilet)*, спальня *(a bedroom)*, кухня *(a kitchen)*, балкон *(a balcony)*;

мэбля: крэсла *(an armchair)*, секцыя *(a cupboard)*, канапа *(a sofa)* і інш.;

электрапрыборы: тэлевізар *(a TV set)*, лямпа *(a lamp)*, стэрэасістэма *(a stereo sound system)*, халадзільнік *(a fridge)*;

элементы дэкору: шторы *(curtains)*, дыван *(a carpet)*, карціна *(a picture)*, люстэрка *(a mirror)*.

**Граматыка**

Паўтарэнне дзеяслова *to have (haven't)* і канструкцый: *This is ... . These are ... .* і інш.

Паўтарэнне займенніка *it*, спосабаў стварэння параўнальнай ступені прыметнікаў *(longer, more beautiful)*.

Ужыванне канструкцый у простых сказах: *There is ... . There are ... .*

Ужыванне дзеясловаў у значэнні магчымасці *(can)*, дазволу *(may)* у сцвярджальных і пытальных сказах.

Ужыванне прыназоўнікаў пры апісанні месцазнаходжання: *in the city, on the first floor, in the kitchen, by (near) the window, in the corner, in the centre* і г. д.

Парадкавыя лічэбнікі ад 1 да 10.

## Т э м а 2. **Што я магу рабіць**

**Лексіка**

Паўтарэнне вывучаных слоў, звязаных з выкананнем бытавых дзеянняў, паўсядзённых абавязкаў.

Лічэбнікі ад 1 да 100. Назвы дзён тыдня.

Выкарыстанне выразаў часу і прыслоўяў «часта», «заўсёды», «часам», «ніколі», «звычайна».

Выразы, якія выкарыстоўваюцца для апісання выконваемых дзеянняў: пісаць і чытаць на англійскай мове *(to write and read in English)*, плаваць *(to swim)*, катацца на веласіпедзе *(to ride a bicycle)*, бегаць *(to run)*, скакаць *(to jump)*, спяваць *(to sing)*, працаваць на камп'ютэры *(to work on the computer)*, танцаваць *(to dance)*, гатаваць *(to cook)*, лічыць *(to count)*, іграць на гітары *(to play the guitar)*, гуляць у футбол *(to play football)*, уключыць/выключыць святло *(to turn on/off the light)*, зачыніць *(to close)*, адкрыць *(to open)*, сядзець *(to sit)*, стаяць *(to stand)*, гаварыць *(to speak, talk, say)* і інш.

**Граматыка**

Выкарыстанне простага цяперашняга часу (без адмаўлення і з адмаўленнем).

Складанне адмоўных і пытальных сказаў з выкарыстаннем дзеясловаў *can, may*. Фарміраванне ўменняў выказаць просьбу, адказ у ветлівай форме. Выкарыстанне выразаў:

*I can ... . I can't ... . Can you ... ? My brother can ... . My brother can't ... .*

*Can you give me ... ? Thank you. Take it, please. I am sorry. Please, give me ... .*

### Тэма 3. **Святы**

**Лексіка**

Паўтор лексічных адзінак, якія абазначаюць прадукты харчавання (гародніна, садавіна), напоі, час прыёму ежы; прыметнікаў, якія характарызуюць смак, якасць ежы; дзеясловаў, звязаных з гатаваннем і прыняццем ежы.

Ужыванне назоўнікаў, якія абазначаюць прадукты харчавання (мяса, рыба, каўбаса, каша, соўс).

Дзеясловы для апісання падрыхтоўкі да святочнага вечара: арганізаваць *(to organize)*, запрасіць *(to invite)*, упрыгожыць *(to decorate)*, пайсці за пакупкамі *(to go shopping)*, купіць *(to buy)*, прыбрацца *(to dress up)*, прадставіць кагосьці *(to introduce)*, прапанаваць *(to offer)*, частавацца *(to help yourself to)*, накрыць на стол *(to set up a table)*, забаўляць *(to entertain)*, мець патрэбу *(to need to)*. Лексічныя адзінкі: талерка *(a plate)*, кружка *(a cup)*, шклянка *(a glass)*, бутэлька *(a bottle)*, скрынка *(a box)*, лыжка *(a spoon)*, відэлец *(a fork)*, рушнік *(a towel)*, гарбата, кава і інш. Выраз: Я жадаў(ла) б *(I'd like)*.

**Граматыка**

Выкарыстанне займеннікаў *some, any* пры канструяванні простых сказаў.

Стварэнне найвышэйшай ступені прыметнікаў *(the hottest, the most beautiful)*. Выкарыстанне выраза *Would you like ... ?*

### Тэма 4. **Мае захапленні**

**Лексіка**

Выразы, якія выкарыстоўваюцца для апісання хобі, вольнага часу: глядзець тэлевізар/фільмы *(to watch TV/films)*; слухаць музыку *(to listen to music)*; гуляць у футбол *(to play football)*; гуляць у камп'ютэрныя гульні *(to play computer games)*; катацца на лыжах/каньках *(to ski/to skate)*, спяваць *(to sing)*, пісаць *(to write)*, чытаць *(to read)*, гатаваць *(to cook)*, пайсці на прагулку *(to go for a walk)*, пайсці ў кіно *(to go to the cinema)*;

плаваць *(to swim)*, катацца на веласіпедзе *(to ride a bicycle)*; размаўляць па тэлефоне *(to speak over the phone)*, работаць у Інтэрнеце *(to work on line)*.

Дзеясловы, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння адносін да выконваемай дзейнасці: падабацца *(to like)*, атрымліваць задавальненне *(to enjoy)*, не падабацца *(to dislike)*, ненавідзець *(to hate)*.

Назвы пор года і месяцаў:

зіма *(winter)*: снежань *(December)*, студзень *(January)*, люты *(February)*;

вясна *(spring)*: сакавік *(March)*, красавік *(April)*, травень *(May)*;

лета *(summer)*: чэрвень *(June)*, ліпень *(July)*, жнівень *(August)*;

восень *(autumn)*: верасень *(September)*, кастрычнік *(October)*, лістапад *(November)*.

Прыметнікі для апісання надвор'я: цёплы *(warm)*, халодны *(cold)*, сонечны *(sunny)*, дажджлівы *(rainy)*, снежны *(snowy)*, ветраны *(windy)*, воблачны *(cloudy)*.

**Граматыка**

Выкарыстанне адмоўнай формы простага цяперашняга часу.

Выкарыстанне ў сказах выразаў часу з прыназоўнікамі *in, on, at*: улетку *(in summer)*, у кастрычніку *(in October)*, у панядзелак *(on Monday)*, у выхадныя *(at weekend)* і г. д.

### *Т э м а 5. **Мае пачуцці**

**Лексіка**

Паўтор назваў дзён тыдня, месяцаў, лічбаў, выразаў з дзеясловам *to be*.

Прыметнікі, якія выкарыстоўваюцца для апісання эмацыянальнага стану, адносін да чаго-небудзь: шчаслівы *(happy)*, сумны *(sad)*, занепакоены *(worried)*, зацікаўлены *(interested)*, абыякавы *(indifferent)*, засмучаны *(upset)*, расчараваны *(disappointed)*, энергічны *(energetic)*, стомлены *(tired)*, які маркоціцца *(bored)*, шумны *(noisy)*, цікаўны *(curious)* і г. д.

Выкарыстанне выразаў: быць народжаным *(to be born)*, сябраваць з *(to be friends with)*, цікавіцца чым-небудзь *(to be interested in)*, захапляцца чымсьці *(to be fond of)*, быць у першым класе *(to be in the 1st form)*, быць падобным на *(to be*

*like)*, быць у школе *(to be at school)*, быць у лагеры *(be at a camp)*, быць на вечары *(to be at a party)*.

**Граматыка**

Ужыванне простых сказаў у простым цяперашнім часе з дзеясловам *to be*.

Складанне простых сказаў у прошлым часе з дзеясловам *to be*.

Стварэнне простага прошлага часу правільных дзеясловаў пры дапамозе канчатка *-ed*. Стварэнне простага прошлага часу некаторых няправільных дзеясловаў *to be — was, were; to take — took; to give — gave; to have — had* і г. д.

Выкарыстанне выразаў простага прошлага часу: учора *(yesterday)*, год назад *(a year ago)*, на мінулым тыдні *(last week)*, у мінулы панядзелак *(last Monday)*, калі я быў *(when I was)*.

Ужыванне прыназоўнікаў часу: *in 1999, at Christmas, at Easter, on Monday, in the evening, at 8 o'clock*.

## * Тэма 6. **Здароўе**

**Лексіка**

Назоўнікі, якія абазначаюць:

сімптомы захворванняў: галаўны боль *(headache)*, боль у спіне *(backache)*, зубны боль *(toothache)*, крывацёк з носа *(nosebleed)*, тэмпература *(temperature)*, сып *(rash)*;

лекавыя прэпараты і сродкі: таблетка *(a pill)*, пластыр *(a plaster)*, мазь *(ointment)*, ёд *(iodine)* і г. д.;

медыцынскія спецыяльнасці: доктар *(a doctor)*, дантыст *(a dentist)*, медсястра *(a nurse)* і інш.

Выкарыстанне выразу *to have pain in ...* .

**Граматыка**

Складанне сказаў з выкарыстаннем простага цяперашняга і простага прошлага часу, канструкцыя *have got*.

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс «Грамадазнаўства» ў дапаможнай школе носіць характар замацавання, абагульнення і сістэматызацыі маральна-этычных, палітыка-прававых, культуралагічных, гістарычных, прыродазнаўчых ведаў, раней атрыманых вучнямі ў працэсе вывучэння розных прадметаў. Шэраг звестак з такіх сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, як філасофія, сацыялогія, этыка, паліталогія, гісторыя, псіхалогія прадстаўлены для вывучэння ўпершыню.

Вучням з інтэлектуальнай недастатковасцю прапануецца для авалодання значна спрошчаная па структуры, скарочаная па аб'ёме, элементарная па ўзроўні абагульненасці сістэма ўяўленняў і ведаў па курсе «Грамадазнаўства». Аднак, нягледзячы на гэта, змест курса захоўвае структурную цэласнасць, характэрную для дадзенай галіны ведаў.

***Мэтай*** курса з'яўляецца стварэнне ўмоў для паспяховай сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі выпускнікоў дапаможнай школы на аснове атрыманых ведаў аб чалавеку, яго ўзаемадзеянні з прыродай, грамадствам і дзяржавай.

Вывучэнне курса «Грамадазнаўства» накіравана на вырашэнне наступных ***задач***:

- ✦ фарміраванне і развіццё асобы, здольнай на аснове засваення атрыманых грамадазнаўчых ведаў разумець свет сацыяльных адносін, знаходзіць сваё месца ў гэтым свеце;
- ✦ фарміраванне ўменняў практычнага ўжывання ведаў аб маральных, этычных, прававых нормах чалавечага суіснавання;
- ✦ выхаванне грамадзянскай адказнасці, заснаванай на ідэалогіі беларускай дзяржавы, гуманістычных і дэмакратычных каштоўнасцях, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

- фарміраванне ведаў і ўменняў, неабходных для ажыццяўлення найбольш тыповых відаў дзейнасці грамадзяніна сваёй краіны;
- развіццё здольнасцей самастойна арыентавацца ў плыні разнастайнай інфармацыі і адпаведна дзейнічаць у тыповых жыццёвых сітуацыях;
- засваенне вучнямі зместу найвышэйшых духоўных каштоўнасцей, правоў чалавека і яго абавязкаў;
- сацыяльная і псіхалагічная падрыхтоўка вучняў дапаможнай школы да самастойнай працоўнай дзейнасці ў рэальных грамадска-эканамічных умовах;
- фарміраванне адэкватнай ацэнкі сваіх магчымасцей;
- фарміраванне і развіццё экалагічнай культуры;
- карэкцыя недахопаў пазнавальнай дзейнасці і маўлення;
- карэкцыя сацыяльных паводзін на аснове засваення агульначалавечых маральна-этычных і прававых нормаў, прынятых у нашай краіне.

Курс «Грамадазнаўства» вывучаецца факультатыўна ў класах паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі па 35 гадзін у кожным класе. Размеркаванне вучэбных гадзін па тэмах з'яўляецца прыкладным. Настаўніку даецца магчымасць самастойна змяняць колькасць гадзін на вывучэнне вызначанага матэрыялу, але ў межах часу, адведзенага вучэбным планам на разгляд курса ў кожным класе.

Па ўсіх вывучаемых тэмах праграмы прадугледжаны абагульняючыя ўрокі.

Прыярытэтам курса з'яўляецца стварэнне ўмоў для паспяховай інтэграцыі вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю ў соцыум на аснове павышэння іх грамадазнаўчай і прававой пісьменнасці, ведання сваіх грамадзянскіх правоў і абавязкаў, умення карыстацца гэтымі ведамі. У гэтай сувязі варта звярнуць асаблівую ўвагу настаўнікаў на неабходнасць узмацнення практычнай накіраванасці курса. Рэкамендуецца вялікую частку вучэбнага матэрыялу прапаноўваць для ўсвядомленага засваення і замацавання праз ролевыя гульні, практычныя заняткі, дыспуты, пабудаваныя на рашэнні праблемных заданняў, абмеркаванні тыповых сітуацый і г. д. Гэта будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў неабходных сацыяльных кампетэнцый, якія грунтуюцца на ведах, уменнях, каштоўнасных арыентацыях і грамадскіх нормах.

## XI КЛАС

**(35 гадзін)**

**Уводзіны** (1 гадзіна)

Сістэма навук, якія вывучаюць чалавека і яго разнастайныя адносіны з прыродай, грамадствам і дзяржавай.

Т э м а 1. **Цела чалавека. Наша здароўе** (5 гадзін)

Чалавек — прадукт развіцця прыроды і грамадства. Чалавечы арганізм — складаная біялагічная сістэма. Наша здароўе як стан душэўна-цялеснага дабрабыту. Паняцце здаровага ладу жыцця. Шкодныя звычкі і іх наступствы. Прафілактыка захворванняў. Догляд цела.

***Асноўныя паняцці***: прырода, здароўе, шкодныя звычкі, алкагалізм, наркаманія, прафілактыка захворванняў, здаровы лад жыцця.

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

Т э м а 2. **Унутраны свет чалавека** (6 гадзін)

Як кожны чалавек усведамляе сябе сярод іншых людзей. Маё «Я». Асоба чалавека. Рысы асобы: акуратнасць, адказнасць, цярплівасць, дысцыплінаванасць, самастойнасць. Эмоцыі чалавека, іх уплыў на паводзіны. Уменне кіраваць сваімі эмоцыямі. Што такое стрэс? Выхаванасць і культура чалавека. Культура маўлення. Ветлівасць і тактычнасць. Добрыя манеры.

***Асноўныя паняцці***: асабістае «Я», тэмперамент, характар, веды, уменні, навыкі, здольнасці, эмоцыі, паводзіны, стрэс, этыкет, манеры, выхаванасць, ветлівасць, тактычнасць.

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

Т э м а 3. **Духоўныя каштоўнасці чалавека** (6 гадзін)

Паняцце «каштоўнасць». Нормы-каштоўнасці. Агульначалавечыя каштоўнасці. Каштоўнасць чалавечага жыцця. Маральныя каштоўнасці. Дабро і зло. Праўда і хлусня. Вера. Ісціна.

Гуманізм. Любоў. Прыгажосць. Сэнс жыцця. Перакананні і ідэалы. Культурныя каштоўнасці. Нацыянальныя і дзяржаўныя каштоўнасці грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Сям'я як каштоўнасць.

***Асноўныя паняцці***: каштоўнасць, духоўнасць, маральнасць, ідэал, дабро, гуманізм, сумленне.

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

### Т э м а 4. **Прырода і чалавек** (6 гадзін)

Прырода — аснова ўзнікнення і жыццядзейнасці чалавека. Узаемасувязь чалавека і прыроды. Уздзеянне чалавека на навакольнае асяроддзе. Экалагічныя праблемы свету. Экалагічная сітуацыя ў нашай краіне. Прыродаахоўная дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па мінімізацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

***Асноўныя паняцці***: прырода, экалогія, экалагічныя праблемы, навакольнае асяроддзе, прыродаахоўная дзейнасць, радыеактыўнасць.

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

### Т э м а 5. **Свет матэрыяльных патрабаванняў чалавека** (6 гадзін)

Матэрыяльныя патрабаванні чалавека, іх віды і задавальненне шляхам куплі-продажу. Паняцце аб вытворчасці. Паняцце эканомікі, эканоміі і беражлівасці. Паняцце ўласнасці. Формы ўласнасці ў нашай краіне. Грошы і іх віды. Таварна-грашовыя адносіны. Цана і кошт тавара. Суадносіны попыту і прапановы. Паняцце рыначнай эканомікі. Даходы чалавека. Заработная плата. Бюджэт сям'і. Хатняя гаспадарка.

***Асноўныя паняцці***: матэрыяльныя патрабаванні, вытворчасць, прыродныя рэсурсы, энергазберажэнне, прыбытак, уласнасць, грошы, тавар, цана, кошт, даходы, попыт, прапанова, бюджэт, падаткі, хатняя гаспадарка.

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА Ў ВУЧНЯЎ ФАРМІРУЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ:

ацэньваць уласныя дзеянні і дзеянні суб'ектаў сацыяльнага жыцця;

фарміраваць на аснове атрыманых ведаў уласныя меркаванні;

будаваць свае адносіны з іншымі людзьмі ў адпаведнасці з агульнапрынятымі нормамі чалавечых паводзін, духоўнымі і маральнымі каштоўнасцямі беларускага народа і дзяржавы;

здзяйсняць на практыцы патрабаванні здаровага ладу жыцця;

прымаць удзел у прыродаахоўных мерапрыемствах;

суадносіць свае расходы з даходамі сям'і;

здзяйсняць пад кіраўніцтвам настаўніка пошук неабходнай сацыяльна значнай інфармацыі ў друкаваных выданнях.

## XII КЛАС

**(35 гадзін)**

**Паўтарэнне вывучанага** (1 гадзіна)

### Т э м а 1. **Чалавек і грамадства** (6 гадзін)

Грамадства як сукупнасць людзей, аб'яднаных пэўнымі формамі сумеснага жыцця і дзейнасці. Грамадства як цэласная сістэма. Перыяды і этапы развіцця чалавечага грамадства. Рэформы і рэвалюцыі. Сферы жыцця грамадства. Грамадскія адносіны. Мараль. Норавы. Права. Звычаі. Традыцыі. Чалавек — грамадская істота. Чалавек у грамадстве.

***Асноўныя паняцці***: грамадства, соцыум, сферы жыцця грамадства, грамадскія адносіны, рэформа, рэвалюцыя, мараль, норавы, звычаі, традыцыі, права, эвалюцыя.

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

### Т э м а 2. **Грамадства і дзяржава** (6 гадзін)

Паняцце «дзяржава». Умовы ўзнікнення дзяржавы. Прыметы і функцыі дзяржавы. Асноўныя формы дзяржаўнага кі-

равання. Тыпы дзяржаўнага ладу. Унітарныя і федэратыўныя дзяржавы.

Дзяржава Рэспубліка Беларусь. Канстытуцыя — асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Асновы канстытуцыйнага ладу нашай краіны. Народ — адзіная крыніца дзяржаўнай улады. Улада заканадаўчая, выканаўчая, судовая. Вяршэнства права. Суверэнітэт Рэспублікі Беларусь. Правы і свабоды чалавека — найвышэйшая каштоўнасць і мэта нашай дзяржавы. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці».

***Асноўныя паняцці***: дзяржава, класы, улада, тыпы і формы дзяржавы, рэспубліка, дэмакратычная дзяржава, прававая дзяржава, суверэнітэт, Канстытуцыя, закон Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці».

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

### Т э м а 3. **Дзяржава і чалавек. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь** (6 гадзін)

Паняцце «права» як мера свабоды і адказнасці чалавека. Узаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы. Месца і роля Канстытуцыі ў сістэме прававых актаў дзяржавы. Структура Канстытуцыі.

Асоба, грамадства, дзяржава. Неад’емныя правы асобы. Права на жыццё, асабістую недатыкальнасць і годнасць. Права на ахову здароўя. Права на адукацыю. Права на працу. Права на адпачынак. Палітычныя правы і свабоды. Сацыяльна-эканамічныя і культурныя правы. Асноўныя абавязкі грамадзян. Баланс правоў і абавязкаў. Прававая адказнасць.

Выбарчая сістэма ў Рэспубліцы Беларусь. Рэферэндум.

Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Урад — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Суд. Мясцовае кіраванне і самакіраванне.

***Асноўныя паняцці***: права, грамадзянін, Канстытуцыя, правы і абавязкі грамадзян, выбары, рэферэндум, Прэзідэнт, Парламент — Нацыянальны сход (Палата Прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі), Урад — Савет Міністраў, суды, мясцовае кіраванне і самакіраванне.

**Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

### Т э м а  4. **Чалавек і эканоміка** (5 гадзін)

Паняцце «эканоміка». Роля эканомікі ў жыцці грамадства і чалавека. Эканамічныя рэсурсы. Структура эканомікі. Рынак, яго формы і віды. Попыт і прапанова.

Канкурэнцыя. Прадпрымальніцтва. Падаткі, іх віды. Значэнне падаткаў. Бюджэт дзяржавы. Узровень жыцця. Паняцце «праца». Значэнне працы. Працоўная сіла і рынак працы. Занятасць і беспрацоўе. Роля дзяржавы ў эканоміцы.

***Асноўныя паняцці***: эканоміка, эканамічныя рэсурсы, рынак, попыт і прапанова, канкурэнцыя, прадпрымальніцтва, падаткі, бюджэт, працоўная сіла, рынак працы, беспрацоўе, уласнасць.

### **Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

### Т э м а  5. **Чалавек і яго праца** (6 гадзін)

Праца як найбольш дастойны спосаб самасцвярджэння чалавека. Парадак працаўладкавання. Працоўны дагавор. Кантракт. Асаблівасці працы непаўналетніх працаўнікоў. Аплата працы. Спыненне працоўнага дагавора. Працоўны час і час адпачынку. Ахова працы. Парадак вырашэння працоўных спрэчак. Працоўная і выканальніцкая дысцыпліна. Прафесійныя саюзы.

***Асноўныя паняцці***: працоўнае заканадаўства, працоўны дагавор, кантракт, працаўнік, наймальнік, працоўны час, час адпачынку, водпуск, ахова працы, працоўныя спрэчкі, камісія па працоўных спрэчках, прафесійныя саюзы.

### **Абагульняючы ўрок** (1 гадзіна)

### У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА Ў ВУЧНЯЎ ФАРМІРУЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ:

даваць кароткую характарыстыку розным сферам грамадскага жыцця;

суадносіць свае ўласныя дзеянні і дзеянні іншых сацыяльных суб'ектаў з маральнымі і прававымі нормамі;

будаваць сваю лінію паводзін на аснове ведання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, асноў працоўнага заканадаўства, дакументаў аб правах дзіцяці;

правільна афармляць звароты ў дзяржаўныя органы;

прымаць пасільны ўдзел у дыскусіях, выказваць, па меры магчымасці, свае адносіны да вывучаемых пытанняў.

### *Літаратура*


1. Основы идеологии белорусского государства. — Мн.: Нар. асвета, 2005.

2. Основы права Республики Беларусь: Понятия и схемы / В. А. Круглов, Е. В. Шейпак. — Мн.: Амалфея, 2003.

3. *Петкевич, И. Е.* Организация и содержание образовательного процесса в X—XI классах углубленной социальной и профессиональной подготовки // Дэфекталогія. — 2005. — № 3. — С. 13—20.

4. Программа специальной (коррекционной) образовательной школы VIII вида: 5—9 кл.: в 2 сб. / под ред. В. В. Воронковой. — М.: ВЛАДОС, 2001. — Сб. 1. — С. 99—102.

5. Человек. Общество. Государство. VIII—XI классы: Программы для учреждений, обеспечивающих получение общего среднего образования. — Мн., 2003.

# КУЛЬТУРА СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс «Культура сямейных адносін» для вучняў XI—XII класаў накіраваны на падрыхтоўку да самастойнага і незалежнага жыцця, выхаванне маральна-прававой сталасці асобы ў кантэксце сямейна-бытавой сферы.

Праблема падрыхтоўкі школьнікаў да сямейнага жыцця разглядаецца як састаўная частка цэласнага працэсу маральнага фарміравання асобы і ўключае шэраг аспектаў: агульнасацыяльны, этычны, прававы, псіхалагічны, фізіёлага-гігіенічны, педагагічны, эстэтычны, гаспадарча-эканамічны.

***Мэта*** курса «Культура сямейных адносін» — замацаванне ведаў аб шлюбе і сямейным жыцці, фарміраванне ў вучняў гатоўнасці да сямейнага жыцця.

***Задачы*** курса:

- фарміраванне ведаў аб псіхафізічных працэсах палавога выхавання, гігіене палоў, палавых адносін;
- фарміраванне маральных пазіцый і ўстановак па пытаннях шлюбна-сямейных узаемаадносін;
- фарміраванне сістэмы пазітыўных установак на ўсвядомлены выбар мужа (жонкі), адказнае выкананне шлюбных і бацькоўскіх абавязкаў;
- падрыхтоўка да адказнага шлюбу, бацькоўства, выпрацоўка аптымальных рэпрадукцыйных установак;
- замацаванне ўяўленняў аб здаровым ладзе жыцця;
- развіццё ў вучняў упэўненасці ў сваіх магчымасцях і здольнасцях прымаць правільныя рашэнні, пераадольваць жыццёвыя цяжкасці, будаваць адэкватныя ўзаемаадносіны ў сацыяльна прымальных варыянтах.

Прапедэўтыкай пры навучанні культуры сямейных адносін з'яўляюцца прадметныя галіны «Чалавек і свет», «Біялогія», «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка», факультатыўныя заняткі школьнага кампанента вучэбнага плана, выхаваўчыя заняткі.

Мэты і задачы вызначаюць логіку і структуру курса. Праграма курса распрацавана на аснове канцэнтрычнага прынцыпу і ўключае раздзелы: «Пол і палавая культура», «Узроставыя змены арганізма падлеткаў», «Гігіена полу», «Культура пачуццяў і адносін», «Закон і падлетак», «Гатоўнасць да шлюбу і стварэння сям'і», «Планаванне сям'і», «Бацькі і дзеці», «Сямейны дабрабыт».

Дадзеная праграма ўзаемазлучана з урокамі сацыяльнай арыенціроўкі і элементамі эканамічных ведаў.

Пры правядзенні ўрокаў культуры сямейных адносін настаўніку неабходна ўлічваць:

- асаблівасці псіхасексуальнага развіцця і заканамернасці палавога выхавання;
- узровень сфарміраванасці ў вучняў ведаў і практычных уменняў, неабходных для будучага сямейнага жыцця;
- асаблівасці бацькоўскіх сем'яў;
- узаемасувязь вучэбнай і пазавучэбнай работы, школьнага і сямейнага выхавання;
- формы і метады навучання ў залежнасці ад аспекту вывучаемай праблемы.

Падчас вывучэння курса плануюцца ўрокі разнастайных відаў: урок-апавяданне, урок-гутарка, урок-сітуацыя, урок-практыкум. Пры правядзенні ўрокаў настаўнік кіруецца прынцыпамі праўдзівасці, рэалістычнасці, даверлівасці, адраснасці, чысціні.

Урокі па асобных тэмах («Гігіена падлеткавага ўзросту», «Віды кантрацэпцыі», «Наступствы аборту для жаночага арганізма», «Гігіена цяжарнай жанчыны», «Роды як фізіялагічны працэс» і інш.) дапускаецца праводзіць з дзяўчынамі і юнакамі паасобку.

Пры навучанні культуры сямейных адносін выкарыстоўваюцца інтэрактыўныя метады: ролевая гульня, ролевыя сітуацыі, праблемныя сітуацыі, мадэліраванне рэальных сітуацый, рашэнне розных «этычных задач».

Курс «Культура сямейных адносін» распрацоўваецца на пэўным матэрыяле, аналізе і мадэліраванні рэальных жыццёвых сітуацый. Разгляд і абмеркаванне зместу тэм курса варта планаваць такім чынам, каб у вучняў фарміравалася ўстаноўка на стварэнне сям'і ў сацыяльна прымальным варыянце, узнікала сур'ёзнае стаўленне да выбару ўласных жыццёвых прыя-

рытэтаў, удасканальвалася здольнасць да аналізу і прагназіравання сваіх дзеянняў і ўчынкаў. Інтымнасць зместу асобных тэм, які не правакуе ў падлеткаў дадатковай сексуальнай цікавасці, стварае ўмовы для развіцця самарэгуляцыі ў поларолевых паводзінах.

Своеасаблівасць зместу, формаў і метадаў прад'яўляе асобыя патрабаванні да прафесійнай кампетэнтнасці і асобы настаўніка. Выкладчык курса — гэта вопытны аўтарытэтны педагог, з пэўным педагагічным тактам, добразычлівы, эмацыянальны, шчыры ў адносінах з вучнямі.

Настаўніку даецца права ўносіць змены і дадаткі ў праграму, размяркоўваць вучэбны матэрыял па чвэрцях, не парушаючы паслядоўнасці вывучэння курса.

## XI КЛАС

### 1. Пол і палавая культура

Фізічныя і псіхалагічныя адрозненні палоў. Прыметы палоў: першасныя і другасныя. Палавая прыналежнасць і сацыяльная роля. Мужнасць і жаноцкасць. Культура пачуццяў і адносін. Узаемаадносіны паміж людзьмі. Адносіны юнакоў і дзяўчын. Сяброўства юнака і дзяўчыны.

### 2. Узроставыя змены арганізма падлеткаў

Анатама-фізіялагічныя асаблівасці мужчынскага і жаночага арганізмаў. Паняцце аб перыядзе палавога паспявання. Асаблівасці палавога паспявання юнака і дзяўчыны. Паспяванне фізічнае і псіхалагічнае.

### 3. Гігіена полу

Гігіена падлеткавага ўзросту. Асабістая гігіена дзяўчыны і юнака. Рэжым дня падлетка. Здаровы лад жыцця. Формула здароўя: асабістая гігіена, харчаванне, сон, фізічная актыўнасць, адпачынак. Шкодныя звычкі і іх уплыў на арганізм, які расце.

### 4. Гатоўнасць да шлюбу і стварэння сям'і

Уяўленні школьнікаў аб сямейным шчасці. Матывы стварэння сям'і. Выбар спадарожніка жыцця.

Сям'я. Склад сям'і. Значэнне сям'і ў жыцці кожнага чалавека. Духоўныя, сяброўскія, матэрыяльныя сувязі ў сям'і.

Функцыі сям'і. Сямейныя ролі: мужа, жонкі. Размеркаванне абавязкаў у сям'і. Сацыяльныя абавязкі і адказнасць кожнага члена сям'і. Правы кожнага члена сям'і.

### 5. Планаванне сям'і

Планаванне нараджэння дзіцяці. Папярэджанне непажаданай цяжарнасці. Бяспечны секс. Асноўныя віды кантрацэпцыі. Наступствы аборту для жаночага арганізма.

Падрыхтоўка да нараджэння здаровага дзіцяці. Цяжарнасць як фізіялагічны працэс, сімптомы цяжарнасці. Гігіена цяжарнай жанчыны: наведванне жаночай кансультацыі, рэжым працы і адпачынку, харчаванне, адзенне і абутак. Адносіны людзей да цяжарнай жанчыны.

### 6. Бацькі і дзеці

Мацярынства, бацькоўства — новыя сацыяльныя ролі. Роля маці ў выхаванні дзіцяці. Роля бацькі ў выхаванні дзіцяці.

Шчаслівая і няшчасная сям'я. Культура зносін бацькоў і дзяцей. Правы і абавязкі бацькоў. Правы і абавязкі дзяцей. Парушэнні правоў дзіцяці. Святы: каляндарныя і сямейныя. Культура арганізацыі і правядзення сямейных свят.

## XII КЛАС

### 1. Пол і палавая культура

Роля мужчыны і жанчыны ў грамадстве, сям'і. Прызнанне і прыняцце палавых асаблівасцей. Палавая сталасць і маральныя нормы паводзін і адносін.

### 2. Гігіена полу

Шкодныя звычкі: курэнне, ужыванне алкаголю, наркотыкаў.

Курэнне і яго матывы. Алкагалізм: наступствы і лячэнне. Наркаманія: прычыны, наступствы, лячэнне. Таксікаманія: прычыны і наступствы.

### 3. Культура пачуццяў і адносін

Захапленне, закаханасць і каханне як псіхалагічныя станы. Агульнае і рознае ў сяброўстве і каханні. Адносіны закаханых людзей. Узаемнае і неўзаемнае каханне. Разрыў у адносінах, пачуццё крыўды і шляхі яго пераадолення.

Спосабы самастойнага вырашэння псіхалагічнай праблемы. Тэлефон даверу.

### 4. Закон і падлетак

Асабістая адказнасць за свае паводзіны. Сексуальныя злачынствы і закон. Прававая і маральная адказнасць.

Згвалтаванне: юрыдычны, маральны, псіхалагічны аспекты. Прафілактыка паводзін, якія правакуюць сексуальны гвалт.

Медыцынскія і рэабілітацыйныя ўстановы, якія аказваюць дапамогу ахвярам сексуальнага гвалту.

### 5. Гатоўнасць да шлюбу і стварэння сям'і

Жаніх і нявеста. ЗАГС. Парадак падачы заявы на рэгістрацыю шлюбу.

Знаёмства з бацькамі будучага мужа (жонкі). Знешні выгляд жаніха і нявесты. Правілы паводзін нявесты і жаніха на вяселлі. Традыцыі на вяселлі. Шлюб. Правілы паводзін у царкве. Юрыдычныя паняцці: «шлюб», «сям'я». Нарматыўна-прававыя дакументы: «Грамадзянскі кодэкс», «Кодэкс аб шлюбе і сям'і».

Маладая сям'я, яе функцыі і абавязкі. Узаемаадносіны ў маладой сям'і. Сацыяльная роля мужа і жонкі. Павага і ўзаемадапамога ў маладой сям'і.

Роля сваякоў у жыцці маладой сям'і. Побыт маладой сям'і, матэрыяльныя і жыллёвыя цяжкасці. Адаптацыя маладых мужа і жонкі: матэрыяльна-бытавая, маральная, псіхалагічная, інтымна-асобасная. Адносіны маладых мужа і жонкі з бацькамі. Радасці і праблемы сумеснага пражывання маладых мужа і жонкі з бацькамі.

### 6. Планаванне сям'і

Развіццё плода ў арганізме маці. Роды як фізіялагічны працэс. Гігіена і харчаванне жанчыны ў перыяд кармлення дзіця-

ці. Нованароджанае дзіця. Асаблівасці догляду нованароджанага. Кармленне дзіцяці. Развіццё дзіцяці. Асаблівасці развіцця дзіцяці да года.

### 7. Бацькі і дзеці

Ролевыя адносіны мужа-бацькі, жонкі-маці. Бацькі як асноўныя выхавальнікі дзіцяці. Асаблівасці выхавання дзіцяці ў розныя перыяды яго жыцця: немаўля, дашкольнік, школьнік, падлетак. Бацькоўскі аўтарытэт. Стылі выхавання і ўзаемаадносіны бацькоў з дзецьмі. Запаведзі выхавання.

Сацыяльнае асяроддзе і выхаванне. Канфлікты паміж бацькамі і дзецьмі: прычыны, папярэджанне і пераадоленне. Праблемы ўзаемаадносін з дзецьмі пры скасаванні шлюбу бацькоў.

### 8. Сямейны дабрабыт

Сямейны канфлікт. Прычыны канфліктаў, культура сямейнай спрэчкі. Папярэджанне канфліктаў.

Скасаванне шлюбу: прычыны і наступствы. Маральныя паводзіны ў сітуацыі скасавання шлюбу. Шлюбаскасавальны працэс. Падзел маёмасці. Аліменты.

### ВУЧНІ ПАВІННЫ

**В е д а ц ь:**

анатама-фізіялагічныя асаблівасці мужчынскага і жаночага арганізмаў;

асаблівасці палавога развіцця і паспявання;

добрыя і шкодныя звычкі;

асновы ўзаемаадносін паміж паламі з улікам іх узроставай дыферэнцыяцыі: дзяўчына—юнак, жанчына—мужчына;

асноўныя маральныя правілы паводзін у сітуацыі канфлікту або распаду сям'і;

асноўныя заканадаўчыя дакументы аб шлюбе і сям'і;

правы і абавязкі кожнага члена сям'і;

сямейна-ролевыя адносіны;

наступствы няправільных палавых паводзін;

асноўныя віды кантрацэпцыі.

**У м е ц ь:**

выконваць рэжым дня з улікам узроставых змен арганізма;

практычна ўжываць веды аб санітарна-гігіенічных нормах (гігіена полу);

усталёўваць добразычлівыя адносіны адзін з адным, з бацькамі, дарослымі;

папярэджваць і вырашаць узнікаючыя канфліктныя сітуацыі;

арганізоўваць розныя віды дзейнасці сям'і: адпачынак, сямейныя святы;

планаваць сям'ю;

выконваць элементарныя абавязкі, звязаныя з нараджэннем і выхаваннем дзіцяці.

## *Літаратура*


1. *Зыгманова, И. В.* Подготовка к семейной жизни учащихся с умственной отсталостью в контексте формирования жизнеспособной личности // Современное общество и специальное образование: материалы международной научной конференции 25—26 апреля 2007. — СПб., 2007.

2. *Исаев, Д. Н.* Половое воспитание детей: Медико-психологические аспекты / Д. Н. Исаев, В. Е. Каган. — Л., 1988.

3. *Погодина, Е. К.* Основы семейной жизни. — Витебск, 2003.

4. Половое воспитание, профилактика СПИДа среди младших школьников: Методические рекомендации для учителей начальных классов, классных руководителей и воспитателей групп продленного дня / сост.: Л. И. Дурейко [и др.]. — Мн.: 1998.

5. *Смагина, Л. И.* Уроки будущим мужьям и женам: Жизнь вне стен интерната / Л. И. Смагина, А. С. Чернявская. — Мн., 2006.

# ЗМЕСТ

Камп'ютэрная грамата ................................ 3
Хімія і фізіка ў быце ................................ 14
Элементы замежнай (англійскай) мовы ........ 23
Грамадазнаўства ........................................ 36
Культура сямейных адносін ......................... 44

Вучэбнае выданне

# ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

**для класаў паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі 1-га аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання**

# КАМП'ЮТЭРНАЯ ГРАМАТА
# ХІМІЯ І ФІЗІКА Ў БЫЦЕ
# ЭЛЕМЕНТЫ ЗАМЕЖНАЙ (АНГЛІЙСКАЙ) МОВЫ
# ГРАМАДАЗНАЎСТВА
# КУЛЬТУРА СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *А. М. Краўчанка*
Камп'ютэрная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктар *Т. Ф. Шайко*

---

Падпісана ў друк 27.06.2008. Фармат 60×84/16. Папера афсетная № 1.
Гарнітура Школьная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 3,02.
Ул.-выд. арк. 2,38. Тыраж 590 экз. Заказ 13.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛВ № 02330/0133300 ад 30.04.2004; ЛП № 02330/0148779 ад 30.04.2004.
220004, Мінск, Караля, 16.

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

## ДЛЯ КЛАСАЎ ПАГЛЫБЛЕНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ І ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ 1-га АДДЗЯЛЕННЯ ДАПАМОЖНАЙ ШКОЛЫ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

- КАМП'ЮТЭРНАЯ ГРАМАТА
- ХІМІЯ І ФІЗІКА Ў БЫЦЕ
- ЭЛЕМЕНТЫ ЗАМЕЖНАЙ (АНГЛІЙСКАЙ) МОВЫ
- ГРАМАДАЗНАЎСТВА
- КУЛЬТУРА СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН

2008